Міністэрства асдукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы»

С.Я. Куль-Сяльверстава

Гістарычная храналогія: практыкум

для студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей

Гродна, ГрДУ імя Я.Купалы
2009

УДК
ББК С99

Рэцэнзенты:
Працэнка В.Э., кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры славянскіх дзяржаў ГрДУ імя Я. Купалы;
Соркіна І.В., кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі ГрДУ імя Я. Купалы.
.

Рэкамендавана Саветам факультэта гісторыі і сацыялогіі ГрДУ імя Я. Купалы.

Куль-Сяльверстава, С.Я.
Гістарычная храналогія: практыкум / С.Я. Куль-Сяльверстава. – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2009. — 52 с.
ISBN

Практыкум утрымлівае рэкамендацыі па акрэсленню і ўдакладненню дат, заданні для самастойнай работы, храналагічныя табліцы і спіс літаратуры па гістарычнай храналогіі. Прызначаны для студэнтаў гістарычных спецыяльнасцяў, даследчыкаў-гісторыкаў, настаўнікаў, а таксама для аматараў гісторыі і краязнаўства.

Змест

Уводзіны

Храналогія — дапаможная гістарычная дысцыпліна, якая вывучае сістэмы летазлічэння і гісторыю іх развіцця. Задачамі храналогіі з'яўляецца акрэсленне часу гістарычных падзей, а таксама вывучэнне сістэм летазлічэння ў іх развіцці і ўзаемадзеянні. Даследаванне крыніц патрабуе ад гісторыка валодання навыкамі працы з адзінкамі вымярэння часу, якія ўжываліся на працягу стагоддзяў, а таксама прынцыпамі даціроўкі крыніц, падзей, якія ў іх згадваюцца, з дапамогай ускосных дадзеных. Практыкум утрымлівае кароткія рэкамендацыі па рабоце з разнастайнымі сістэмамі вымярэння часу, якія бытавалі на беларускіх землях; формулы і табліцы для рэдукцыі дат, іх акрэслення і ўдакладнення з дапамогай ускосных звестак; заданні для самастойнай работы і спіс літаратуры, якая можа дапамагчы ў больш грунтоўным вывучэнні гістарычнай храналогіі. Паколькі беларускаму гісторыку даводзіцца працаваць не толькі з айчыннымі крыніцамі, але і з дакументамі, створанымі ў блізкім замежжы, у Практыкуме ўтрымліваюцца матэрыялы, якія могуць дапамагчы даследчыку ў гэтым выпадку.

Пры цытаванні дакументаў у прыкладах і заданнях аўтарка імкнулася прытрымлівацца прынцыпаў археаграфічнага выдання дакументаў, аднак па тэхнічных прычынах архаічныя літары кірыліцы былі заменены адпаведнымі па гучанню літарамі сучаснага кірылічнага алфавіту. Польскамоўныя і лацінскамоўныя цытаты пададзены паводле іх публікацыі ў літоўскім выданні «Метрыкі ВКЛ», пераклад зроблены аўтаркай.

Практыкум прызначаны для студэнтаў гістарычных спецыяльнасцяў, даследчыкаў-гісторыкаў, настаўнікаў, а таксама для аматараў гісторыя і краязнаўства.

ТЭМА 1. ЭРА АД СТВАРЭННЯ СВЕТУ, САКАВІЦКІ, УЛЬТРАСАКАВІЦКІ І ВЕРАСНЁЎСКІ ПАЧАТАК ГОДА.

Пры пераводзе дат з эры ад стварэння свету на эру ад Раства Хрыстова (эру Дыянісія) належыць улічваць, калі ў разглядаемы перыяд адзначаўся пачатак года. На беларускіх землях у XII–XIII стст. выкарыстоўваліся сакавіцкі і ўльтрасакавіцкі пачатак года, у XIV–XV стст. – вераснёўскі і студзеньскі, з XVI ст. – студзеньскі і вераснёўскі. Але ад гэтага правіла могуць быць адхіленні ў залежнасці ад паходжання крыніцы.

Для пераводу даты на сучасную эру, калі вядомы стыль дакумента, ужываюцца формулы і табліцы.

Сакавіцкі пачатак года

Калі падзея прыпадае на час паміж сакавіком і снежнем, каб атрымаць дату па эры ад Раства Хрыстова, належыць ад даты па эры ад стварэння свету аднімаць 5508 гадоў, калі падзея прыпадае на студзень-люты – аднімаем 5507 гадоў.

Прыклады

30 ліпеня 6727 г. будзе адпавядаць 30 ліпеня 1219 г. (6727-5508=1219).
27 лютага 6727 г. будзе адпавядаць 27 лютага 1220 г.(6727-5507= 1220).

Вераснёўскі пачатак года

Калі падзея прыпадае на час паміж вераснем і снежнем, каб атрымаць дату па эры ад Раства Хрыстова, належыць ад даты па эры ад стварэння свету аднімаць 5509 гадоў, калі падзея прыпадае на студзень-верасень – аднімаем 5508 гадоў.

Прыклады

20 верасня 6959 г. будзе адпавядаць 20 верасня 1450 г. (6959-5509 = 1450).
30 мая 6834 г. будзе адпавядаць 30 мая 1326 г. (6834-5508 = 1326).

Ультрасакавіцкі пачатак года

Калі падзея прыпадае на час паміж сакавіком і снежнем, каб атрымаць дату па эры ад Раства Хрыстова, належыць ад даты па эры ад стварэння свету аднімаць 5509 гадоў, калі падзея прыпадае на студзень-люты – аднімаем 5508 гадоў.

Прыклады

24 лістапада 6778 г. будзе адпавядаць 24 лістапада 1269г. (6778-5509=1269).
15 студзеня 6653 г. будзе адпавядаць 15 студзеня 1145 г. (6653-5508=1145).

Калі стыль, які выкарыстоўваецца ў крыніцы, невядомы, або нельга вылічыць, у якім месяцы яна адбывалася, – указваюцца ўсе магчымыя варыянты даты. У гэтым выпадку дата запісваецца з выкарыстаннем касой рысы: 1233/1234; 1222/1223/1224 г.

ТЭМА 2. УДАКЛАДНЕННЕ ДАТЫ ПА ЗГАДКЕ ІНДЫКТА ГОДА

Індыктам называецца нумар года ў 15-гадовым цыкле. Традыцыя лічэння індыктамі ў еўрапейскім свеце склалася яшчэ ў антычныя часы і існавала паралельна з пагадовым лічэннем. Змена індыкта наступала 1 верасня – адпаведна са зменай года па вераснёўскаму стылю. Пры выкарыстанні іншых пачаткаў года – у сакавіку ці студзені – індыкт усё роўна, як правіла, змянялі 1 верасня. Таму вераснёўскія гады маюць адзін індыкт, усе астатнія – два. Наяўнасць індыкта ў

даце крыніцы дае магчымасць удакладніць, праверыць даціроўку, а ў некаторых выпадках – і акрэсліць стыль, які ўжываўся ў дакуменце, а таксама вылічыць дату падзеі.

Індыкт можна вылічаць простай арыфметычнай аперацыяй, а можна выкарыстоўваць табліцу. Пры вылічэнні індыкта належыць нумар года па эры ад стварэння свету падзяліць на 15 – рэшта і будзе індыктам. Калі ў выніку дзялення рэшты не засталося, значыць індыкт роўны 15. Пры даце па эры ад Раства Хрыстова належыць гэтую дату перавесці ў эру ад стварэння свету і атрыманую суму падзяліць на 15. Атрыманы індыкт будзе адпавядаць для студзеньскага года студзеню-верасню, а з верасня па студзень ён будзе на адзінку большы. Наяўнасць двух індыктаў у аднаго года стварае магчымасць удакладнення стылю крыніцы.

Прыклады

У крыніцы пазначана дата: 1432 год 25 верасня індыкта 11:

1432+5508=6940; 6940 : 15 = 462 і рэшта 10.

Такім чынам, індыкт 6940 года – калі выкарыстоўваецца вераснёўскі стыль, роўны 10. У крыніцы ўжыты студзеньскі стыль, дзе год мае два індыкты – са студзеня па верасень – індыкт 10, з верасня па студзень – 11. Пісар не памыліўся: указваючы дату па студзеньскаму стылю, змяніў індыкт у верасні.

У крыніцы пазначана дата: 1561 індыкта 5:

1561+5508=7069;7069: 15 = 471 і рэшта 4.

Такім чынам, індыкт вераснёўскага 7069 года будзе 4. Указаны ў крыніцы 5 індыкт, хутчэй за ўсё, сведчыць, што падзея адбывалася пасля 1 верасня, а пісар ужываў студзеньскі стыль.

У крыніцы пазначана дата: 6780 г., 17 мая, індыкта 14:

6780:15=452 і рэшта 0, значыць, індыкт года – 15.

Такім чынам, у крыніцы, хутчэй за ўсё, выкарыстаны ультрасакавіцкі стыль, паколькі пры такім пачатку года ад сакавіку да верасня будзе індыкт 14, а з верасня па сакавік – 15.

Індыкт можа быць акрэслены і з дапамогай табліцы індыктаў (Табліца № 2). Дзеля гэтага ў верхняй частцы табліцы належыць знайсці тысячы і сотні гадоў зправа, калі дата дадзена па эры ад стварэння свету; або злева, калі ўжыта дата па эры ад Раства Хрыстова. У сярэдзіне табліцы належыць знайсці дзесяткі і адзінкі гадоў вылічаемай даты. На перасячэнні гэтых калонак і будзе індыкт года па вераснёўскаму стылю.

Часам у крыніцах для даціроўкі падзеі ці дакумента ўжываецца толькі індыкт, без згадкі года. У гэтых выпадках належыць прыцягваць ускосныя дадзеныя з самой крыніцы, каб акрэсліць прыблізны час падзей. Такімі ўскоснымі дадзенымі могуць быць згадкі аб князях ці каралях, у час праўлення якіх адбывалася падзея, аб важных палітычных здарэннях ці з'явах – вайне, перамір'і і г.д., даты якіх вядомыя.

Прыклады

1. У т.3 Метрыкі ВКЛ за 1440–1498 гг. змешчаны наступны запіс: “Саве, соко*л*нику се*л*цо Остапъково; выме*р* де*и* бе*з* наследъка, а соко*л*ни[к] же бы*л*. Приказ пана Товтьвиловъ у Скидли. Мая 11, инъдик(т) 1.» (Литовская Метрика=

Lietubos metrica/ Лит. ист.ин-т – Вильнюс:Zara, 1998 – 3 Книга записей (1940–1498). – с. 24). З прыведзенага дакумента бачна, што пан Таўтвіл загадаў даць Саве-сакольніку сяло Астапкава, уладальник якога не меў нашчадкаў. Гэты загад быў выдадзены ў Скідалі.

Кніга данін (Кн.3), у якой згадваецца Скідаль, дайшла да нас у копііі, складзенай ў канцы 16 ст. пры ўпарадкаванні архіва Вялікага княства Літоўскага. Па меркаванню М.Г.Беражкова, якое падзяляе і А.Груша, пры стварэнні копіі дакументы заносіліся ў яе без дакладнай храналагічнай паслядоўнасці. Таму рэканструкцыя даты можа быць зроблена толькі на падставе ўскосных дадзеных: згадцы аб аўтары загаду (Таўцівіл) і нумару індыкта.

Рэканструкцыя даты можа адбывацца наступным чынам. Таўцівіл Мантоўтавіч (Таўтвіл) быў сябрам Паноў-Рады пры Казіміры Ягелончыку. Урад, на якім ён знаходзіўся, дазваляў у той час рабіць дараванні. Найбольш ранняя вядомая згадка аб Таўцівіле маецца ў хроніцы Яна Длугаша – 1455 г., калі Таўцівіл уваходзіў у склад дэлегацыі ВКЛ да караля і вялікага князя (Цішчанка В.В. Вялікакняжацкая ўлада ў структуры органаў дзяржаўнага кіравання ВКЛ у канцы 14–пачатку 16 стст. Дысертацыя на суіск. вуч. ступ. канд. гіст. навук. – Мінск, 2006 – с.48). Таўцівіл Мантоўтавіч знаходзіўся ў складзе Паноў-Рады і ў 1460-я гады. Ён неаднаразова згадваецца ў дакументах Метрыкі ў гэты перыяд. На 1450–1460-я гады ўказвае таксама тая акалічнасць, што ў масіве дакументаў, якія знаходзяцца ў кніге данін ў бліжэйшым атачэнні прыведзенай вышэй згадкі, сустракаецца імя пісара канцылярыі Якуба, час знаходжання якога на гэтым урадзе акрэсліваецца 1449–1476 гг. Такім чынам, шукаемая дата з вялікай верагоднасцю можа знаходзіцца паміж 1450– 1480 гадамі.

У прыведзенай цытаце згадваецца індыкт 1 і дата 11 мая. Індыкт 1 у акрэсленым намі прамежку часу з 1450 г. па 1480 г. са студзеня па верасень маюць 1468 г., а таксама 1453 г. і 1483 г.

1468+5508= 6976; 6976 : 15= 647 ; рэшта 1 (са студзеня па верасень).

1453+5508=6961; 6961:15=464; рэшта 1 (са студзеня па верасень).

1483=5508=6991; 6991:15=466 ;рэшта 1 (са студзеня па верасень).

Супраць 1483 г. гаворыць тое, што ад першай вядомай нам згадкі Таўцівіла Мантоўтавіча як сябра Рады (1455 г.) гэтую дату аддзяляе 28 гадоў. У тую эпоху такі тэрмін палітычнага «доўгажыхарства» сустракаецца надзвычай рэдка. Малаверагодна, што Таўцівіл быў падобным выключэннем. Таму застаюцца 1453 і 1468 гады. Такім чынам, дастаткова вялікая верагоднасць, што першая згадка г. Скадаля ў Метрыцы ВКЛ – 11 мая 1453 г. або 11 мая 1468 г. Выбар паміж дзьвюма датамі можна будзе зрабіць, ажыццявіўшы дадатковыя пошукі.

2. У крыніцы, датаванай індыктам 1, але без года, згадваецца вялікі князь Вітаўт. Час, калі Вітаўт быў вялікім князем – 1392–1430 гг. Звернемся да табліцы індыктаў. У слупку з тысячамі і сотнямі гадоў па эры ад Раства Хрыстова знойдзем 1300 і 1400. Затым пад імі ў слупку індыктаў – лічбу 1 для гэтых абодвух стагоддзяў. Пасля гэтага звернемся да дзесяткаў і адзінак гадоў, якія пазначаны насупраць адшуканага індыкта. На гэтым адрэзку часу індыкт 1 маюць 1393, 1408 і 1423 гады.

Эра ад стварэння свету				Эра ад раства Хрыстова			1800	1900	2000
							1500	1600	1700
							1200	**1300**	**1400**
							900	1000	1100
							600	700	800
							300	400	500
							0	100	200
0	15	30	45	60	75	90	3	13	8
1	16	31	46	61	76	91	4	14	9
2	17	32	47	62	77	92	5	15	10
3	18	33	48	63	78	**93**	6	**1**	11
4	19	34	49	64	79	94	7	2	12
5	20	35	50	65	80	95	8	3	13
6	21	36	51	66	81	96	9	4	14
7	22	37	52	67	82	97	10	5	15
8	**23**	38	53	68	83	98	11	6	**1**
Дзесяткі і адзінкі гадоў							Індыкты		

У часы Вітаўта побач з лічэннем індыктамі ўжываўся вераснёўскі стыль, таму належыць памятаць аб гэтым пры датаванні дакумента. У сучасным летазлічэнні ўжываецца студзеньскі стыль, гады якога маюць па два індыкты. Такім чынам, падзея магла адбывацца з верасня 1392 г. па верасень 1393 г., з верасня 1407 г. па верасень 1408 г., з верасня 1422 г. па верасень 1423 г. – па студзеньскаму стылю. Калі ў крыніцы была б згадка месяца падзеі, можна было б больш дакладна акрэсліць дату, а больш глыбокі аналіз крыніцы дазволіць спыніцца на адной з гэтых дат.

На беларускіх землях традыцыя лічэння індыктамі існавала да сярэдзіны XVI ст. Пазней індыкты сустракаюцца ў дакументах, якія зыходзілі з праваслаўнага асяроддзя. У Маскоўскай дзяржаве індыкты ўжываліся да пачатку XVIII ст.

ТЭМА 3. ДАЦІРОЎКА ПАДЗЕЙ ПА ЗГАДКАХ АСТРАНАМІЧНЫХ З’ЯВАЎ

У крыніцах, асабліва летапісах і хроніках, даволі часта сустракаюцца згадкі аб астранамічных з’явах – сонечных і месячных зацьменнях, каметах. Гэтыя звесткі часам можна выкарыстоўваць для даціроўкі падзей або для ўдакладнення стыля, якім карыстаўся аўтар крыніцы.

Выкарыстанне згадак астранамічных з’яваў для даціроўкі крыніц павінна выкарыстоўвацца вельмі асцярожна – часам у пісьмовых помніках згадваюцца не толькі астранамічныя з’явы, якія носяць цыклічны характар, і таму могуць

датавацца, але і атмасферныя з’явы, праходжанне камет ці буйных небесных цел, якія не маюць пастаяннай арбіты. Важна не блытаць гэтыя з’явы паміж сабой.

У летапісах маюцца паведамленні аб праходжанні камет. Найбольш вядомая з іх – камета Галея, якая мае час абрачэння вакол Сонца 76 гадоў. У летапісны час першае яе з'яўленне адбылося ў 912 г.

Часцей за ўсё ў крыніцах сустракаюцца запісы аб месячных і сонечных зацьменнях. Для вылічэння сапраўднай даты, яе ўдакладнення і знаходжання стыля крыніцы па сонечным і месячным зацменнях існуюць спецыяльныя табліцы: «Перавод даты у дроб года», «Табліца цыклаў» і «Размеркаванне сонечных і месчных зацменняў у цыклах». Па табліцы 3 пературараем месяц і дзень у дроб года і гэтую дроб прыпісваем да нумара года. У табліцы цыклаў знаходзім бліжэйшую меншую лічбу і аднімаем яе ад нумара года з дробам. Атрыманую розніцу правяраем па табліцы «Размеркаванне зацьменняў у цыклах». У ёй *с.* – сонечнае, *м.* – месячнае зацьменне; *ч.* – частковае*, п.*– поўнае; знак «!» паказвае, што зацьменне было абавязкова. Пры параўнанні атрыманай лічбы і лічбы з табліцы зацьменняў дапушчальна розніца ў 0,01– 0,02.

Прыклады

1.У Іпацьеўскім спісе пазначана: «В лето 6621. Бысть знаменье в солнци, в 1 час дня бысть видити всем людям остася солнца мало, акы месяца долов рогома, месяца марта 19 день...»

Праверым слушнасць паведамлення летапісца і ўдакладнім стыль, якім ён карыстаўся.

Пераводзім дату па эры ад стварэння свету на дату ад Раства Хрыстова. Паколькі стыль крыніцы нам невядомы, бярэм сярэднюю лічбу – 5508 г. (у далейшым гэтую аперацыю можна будзе праверыць і ўдакладніць). Пры вылічэнні атрымаем 1113 г. Звернемся да табліцы дробаў. Для 19 сакавіка дроб складзе 0,21; дададзім да даты і атрымаем 1113,21. У табліцы цыклаў знойдзем бліжэйшую меньшую лічбу – 1087,10 і аднімем яе ад 1113,21. Атрыманая розніца складае 26,11 – па табліцы размеркавання сонечных зацьменняў пад гэтай лічбай пазначана поўнае сонечнае зацьменне. Такім чынам, летапісец не памыліўся. Звяртаючыся да пачатку вылічэння, узгадаем, што пры пераводзе даты мы бралі розніцу ў 5508 гадоў – яна характэрна для сакавіцкага і вераснёўскага стыляў. Такім чынам, летапісец карыстаўся ці сакавіцкім, ці вераснёўскім пачаткам года.

2. У Ноўгарадскім першым летапісы па Сінадальным спісе пад 6632 г. згадваецца сонечнае зацменне, якое адбылося 11 жніўня. Пераводзім дату па эры ад стварэння свету на дату па эры ад Раства Хрыстова. Паколькі стыль крыніцы нам невядомы, бярэм сярэднюю лічбу – 5508 г. і пры вылічэнні атрымаем 1124 г. Дроб года для 11 жніўня згодна з табліцай – 0,61, а разам з нумарам года – 1124,61. Бліжэйшае меншае па «Табліцы цыклаў» –1116,04; розніца паміж дзьвюма лічбамі складае 8,57. Па «Табліцы зацменняў» акрэсліваем, што ў гэты дзень было частковае сонечнае зацменне. Для жніўня розніца паміж эрамі складае 5508 гадоў для сакавіцкага і вераснёўскага стыляў. Такім чынам,працуючы з датамі Ноўгарадскага летапісца, належыць памятаць гэтую акалічнасць.

ТЭМА 4. АКРЭСЛЕННЕ ДЗЁН ТЫДНЯ ПА ЮЛЬЯНСКАМУ КАЛЕНДАРУ

Акрэсліць дзень тыдня па юльянскаму календару можна з дапамогай формул і табліц.

Формула Я. Карскага

Дадзеная формула дазваляе ўстанавіць дзень тыдня па эры ад Раства Хрыстова і студзеньскаму стылю.

Нумар дня тыдня роўны рэшце ад выразу:

$$\mathbf{x = \left| [N + \tfrac{1}{4} (N - 1) + T + 5] : 7 \right|}$$

дзе:

x – парадкавы нумар дня тыдня, пачынаючы з нядзелі (нядзеля – 1, субота – 0);
N – нумар дадзенага года;
T – колькасць дзён, якія прайшлі ад пачатку года да вылічаемай даты ўключна.

Прыклад

Вылічым, які дзень тыдня быў 3 мая 1791 па юльянскаму календару:

$x = [1791+ \tfrac{1}{4} (1791 - 1) + 123+5)] : 7 = 338$, у рэшце – 0.

Такім чынам, 3 мая 1791 г. была субота.

Больш універсальнай з'яўляецца ***формула М.Г.Беражкова***, якая дазваляе акрэсліць дзень тыдня не толькі па эры ад Раства Хрыстова, але і па эры ад стварэння свету, а таксама па сакавіцкаму, студзеньскаму, ультрасакавіцкаму і вераснёўскаму стылям. Яна ўяўляе сабой удасканаленую формулу Я.Карскага:

$$\mathbf{x = \left| [N + \tfrac{1}{4} (N - P) + t + r] : 7 \right|},$$

дзе:

x – парадкавы нумар дня тыдня, пачынаючы з нядзелі (нядзеля – 1, субота – 0);
N – нумар дадзенага года;
t – колькасць дзён, якія прайшлі ад пачатку года да вылічаемай даты ўключна;
P – у сакавіцкім годзе – 0; ва ўсіх астатніх – 1;
r – у студзеньскім і вераснёўскім годзе – 5; у сакавіцкім – 4; ультрасакавіцкім – 3.

Дзень тыдня па юльянскаму календару можна таксама акрэсліць з дапамогай табліц. Дзеля гэтага выкарыстоўваецца паняцце вруцэлета – літара-лічба, якая надаецца ўсім нядзелям у акрэсленым годзе, пачынаючы ад першага года ад стварэння света. Вруцэлета можна вылічыць па формуле.

Вруцэлета года будзе роўна рэшце ад выразу:

для года па эры ад стварэння свету

$$\mathbf{W_B = \left| (B + \tfrac{1}{4} B) : 7 \right|},$$

дзе

$\mathbf{W_B}$ – літара-лічба вруцэлета (А, В, Г, Д, Е, S, З);
В – нумар года па эры ад стварэння света;

для года па эры ад Раства Хрыстова

$$W_D = \left|(D + \tfrac{1}{4}D + 25) : 7\right|,$$

дзе

W_D – літара вруцэлета (A, B, C, D, E, F, G);

D – нумар года па эры ад Раства Хрыстова.

Вруцэлета можна знайсці і з дапамогай табліцы. Для гэтага належыць знайсці радок з адпаведнай колькасцю тысяч і соцень гадоў, радок з дзесяткамі і адзінкамі гадоў і на іх перасячэнні – літару вруцэлета. Вруцэлетная літара-лічба у табліцы для юльянскага календара з'яўляецца кірылічнай.

Прыклад

Акрэслім вруцэлета 1563г.

Дзесяткі і адзінкі гадоў						0	1
						6	7
							12
						17	18
						23	
						28	29
						34	35
							40
						45	46
						51	
						56	57
						62	**63**
							68
						73	74
						79	
						84	85
						90	91
Тысячы і сотні гадоў							96
Ад раства Хрыстова			Ад стварэння свету				
200	900	1600	6100	6800		В	**Г**
100	800	**1500**	6000	6700		Г	Д

Такім чынам, вруцэлета 1563 г. – Г.

Цяпер, ведаючы вруцэлета дадзенага года, можна, калі вядомы стыль крыніцы, вылічыць дзень тыдня, на які прыпадае любая дата ў дадзеным годзе. Каб даведацца аб гэтым, належыць звярнуцца да табліцы «Дні тыдня па юльянскаму календару». Спачатку трэба знайсці ў табліцы вядомую нам літару-лічбу вруцэлета і правесці ад яе ўніз вертыкальную рысу да дзён тыдня. Затым, улічваючы стыль, адшукаць патрэбны месяц і згаданы дзень, ад якога правесці гарызантальную лінію да дня тыдня. Пры правядзенні дадзенага вылічэння належыць звяртаць увагу на просты ці высакосны год.

Да прыкладу, нам трэба акрэсліць, які дзень тыдня прыпаў на 25 сакавіка 1563 г. па студзеньскаму стылю. Нам ужо вядома з папярэдняга вылічэння вруцэлета гэтага года – Г. Звернемся да табліцы «Дні тыдня па юльянскаму календару» і знойдзем вруцэлета Г. Затым адшукаем сакавік у раздзеле табліцы «Студзеньскі стыль» і правядзем ад яго ўніз вертыкальную лінію. Затым знойдзем дату – 25 сакавіка і ад яе правядзем гарызантальную лінію да слупка з днямі тыдня у калонцы «Г». Атрымалася серада.

							Месяцы сакавіцкага і ультрасакавіцкага года					
							сакавік лістапад					
							Месяцы студзеньскага года					
							сакавік *лістапад люты(п)*					
							Месяцы вераснёўскага года					
Вруцэлета							*сакавік люты(п) верасень(в) снежань (в)*					
А	В	**Г**	Д	Е	S	З						
Дні тыдня												
нд	пн	аўт	ср	чц	пт	сб		3	10	17	24	31
пн	аўт	**ср**	чц	пт	сб	нд		4	11	18	**25**	
аўт	ср	чц	пт	сб	нд	пн		5	12	19	26	
ср	чц	пт	сб	нд	пн	аўт		6	13	20	27	
чц	пт	сб	нд	пн	аўт	ср		7	14	21	28	
пт	сб	нд	пн	аўт	ср	чц	1	8	15	22	29	
сб	нд	пн	аўт	ср	чц	пт	2	9	16	23	30	

ТЭМА 5. АКРЭСЛЕННЕ ДАТЫ ПА ЗГАДЦЫ ХРЫСЦІЯНСКІХ СВЯТАЎ.

Спасылка на рэлігійнае свята ў крыніцах дастаткова часта замяняе календарную дату. Таму акрэсленне дня свята з’яўляецца неабходным для дацiроўкі падзеі.

У хрысціянскай традыцыі рэлігійны святы падзяляюцца на два тыпы – рухомыя і нерухомыя.

Нерухомыя святы прывязаны да канкрэтных каляндарных дзён, што звязана з іх замацаваннем у хрысціянскай традыцыі ўжо пасля распаўсюджання юльянскага календара. Гэтыя святы звязаны з Новым Запаветам, з гісторыяй Хрыста і яго паплечнікаў, з жыццём Багамацеры. Каб удакладніць дату па згадцы нерухомага рэлігійнага свята, дастаткова ведаць, у які каляндарны дзень яно святкуецца (гл. Табліцы «Нерухомыя праваслаўныя святы і прысвяткі»,

«Нерухомыя каталіцкія святы і прысвяткі»). Складанасць у дадзеным выпадку ў тым, што у крыніцах маюцца варыянты назваў рэлігійных святаў, якія не супадаюць з афіцыйнымі, а выпрацаваны народнай традыцыяй (напр. Грамніцы, Стрэчанне – назва царкоўнага свята *Сретение)*. Таму неабходна дакладна вызначаць, якое свята згадваецца ў крыніцы.

Прыклады

1. У крыніцы пазначана: «А писана сия грамота в день Семиона летопроводца в лето 1451…».

Па календару нерухомых праваслаўных свят дзень Сямёна летаправодца (Св.Семиона) святкуецца 1 верасня. Такім чынам, грамату можна датаваць 1 верасня 1451 г.

2. У крыніцы пазначана: «В лето 6891 Благовещенье бысть в среду по Великодни…».

Па календару нерухомых праваслаўных свят дзень Дабравешчання (Звеставання) адзначаецца 25 сакавіка. Такім чынам, можна акрэсліць і дату Дабравешчання, і дзень Пасхі.

3. У крыніцы пазначана: «На рочкох судовых о святе рымским о трех королях прыпалым…».

Па календару нерухомых каталіцкіх свят дзень Трох каралёў (Trzech króli) святкуецца 6 студзеня. Абапіраючыся на гэтыя звесткі, проста вызначыць, калі пачаліся судовыя паседжанні паводле дадзенай крыніцы.

Пры рабоце з нерухомымі святамі належыць памятаць, што з канца XVI ст. каталіцкая царква карыстаецца грыгарыянскім календаром, праваслаўныя ж святы вызначаюцца паводле юльянскага календара.

Рухомыя святы прыйшлі ў хрысціянства з Старога Запавету, яны звязаны з месячным календаром і таму вандруюць па датах календара сонечнага. Найбольш значнае рухомае свята – Пасха (Вялікдзень), ад даты якога залежыць размеркаванне па календару іншых рухомых святаў.

Пасха згодна з традыцыяй святкуецца ў першую нядзелю пасля вясновага роўнадзенства і поўні. Дата вясновага роўнадзенства замацавана Нікейскім саборам і адзначаецца 21 сакавіка. Усе астатнія кампаненты для вылічэння Пасхі штогод змяняюцца. Нязменным застаецца тэрмін, калі можа быць дзень Пасхі – ад 22 сакавіка да 25 красавіка.

Вылічыць дату Пасхі можна з дапамогай формул і табліц.

Найбольш дасканалай формулай, з дапамогай якой можна вылічыць дату праваслаўнай Пасхі, каторая святкуецца па юльянскаму календару, з'яўляецца **формула Гаўса.**

a – рэшце ад дзялення чысла года на 19,

b – рэшце ад дзялення чысла года на 4,

c – рэшце ад дзялення чысла года на 7,

d – рэшце ад дзялення (19a+15) на 30,

e – рэшце ад дзялення (2b+4c+6d+6) на 7.

Калі d+e больш за 9 – гэта дата красавіка,

калі меньш – дата сакавіка.

Каб атрымаць дату Пасхі, робім яшчэ адну аперацыю:
d+e+22 – для сакавіка,
d+e – 9 – для красавіка.

Прыклады

1. Вылічым, калі святкавалі Пасху ў 1635 г. па юльянскаму календару.
(a) 1635:10=86, рэшта 1;
(b) 1635:4=408, рэшта 3;
(c) 1635:7=233, рэшта 4;
(d) (19 x 1 + 15): 30= 1, рэшта 4;
(e) (2 x 3 + 4 x 4 +6 x 4 +6): 7 = 7, рэшта 3;
4 + 3 = 7; 7< 9 , значыць, Пасха святкавалася ў сакавіку;
4+3+22 = 29.

Такім чынам, у 1635 г. па юльянскаму календару Пасха святкавалася 29 сакавіка.

2. Вылічым, калі святкавалася Пасха ў 1721 г.
(a) 1721:19=90, рэшта 11;
(b) 1721:4=430, рэшта 1;
(c) 1721:7=245, рэшта 6;
(d) (19x11+15):30=7, рэшта 14;
(e) (2x1+4x6+6x14+6):7=16, рэшта 4;
14+4=18; 18>9 – дата красавіка;
18-9=9.

Такім чынам, Пасха ў 1721 г. па юльянскаму календару была 9 красавіка.

Для вылічэння дня Пасхі па юльянскаму календару можна таксама выкарыстаць табліцы. Каб акрэсліць, на які дзень у дадзеным годзе прыходзіцца пасхальная нядзеля, належыць звярнуцца да табліцы «Вруцэлета». Дзень, калі адбываецца перадпасхальная поўня, дапаможа знайсці табліца «Круг Месяца». Прынцып работы з гэтай табліцай той самы, што і з табліцай індыктаў. Затым належыць скарыстаць з табліцы «Акрэсленне дня Пасхі», па якой у адзінае зводзяцца круг Месяца і вруцэлета.

Прыклад

Акрэслім, калі святкавалі Пасху па юльянскаму календару ў 1881 г.
Па табліцы вруцэлета знаходзім літару-лічбу Г.
Па табліцы «Круг Месяца» знаходзім лічбу 17**.**
Затым у табліцы «Акрэсленне дня Пасхі» знаходзім радок, у якім маюцца і літара Г, і лічба 17. У гэтым жа радку пазначана дата Пасхі – 12 красавіка.

Для каталіцкай Пасхі, якая з канца XVI ст. святкуецца па грыгарыянскаму календару, у дадзеным дапаможніку прапанавана табліца пасхалій, у якой пазначаны дні святкавання Пасхі у адрэзку ад 1582 г. па 2000 г. У гэтай табліцы маленькія літары ***с.*** і ***к.*** пазначаюць сакавік і красавік, вялікія ***К.*** і ***С.*** – супадзенне праваслаўнай і каталіцкай Пасхі ў сакавіку і красавіку.

Каталіцкую Пасху можна таксама вылічыць з дапамогай дапрацаванай формулы Гаўса.
a – рэшта ад дзялення чысла года на 19,
b – рэшта ад дзялення чысла года на 4,
c – рэшта ад дзялення чысла года на 7,
d – рэшта ад дзялення (19a+M) на 30,
e – рэшта ад дзялення (2b+4c+6d+N) на 7.

У адрозненні ад юльянскага календара, дзе M і N маюць фіксаванае значэнне, у грыгарыянскім календары іх трэба акрэсліваць у залежнасці ад года.

Значэнне M і N для акрэсленых стагоддзяў

гады	M	N
1582–1699	**22**	**2**
1700–1799	**23**	**3**
1800–1899	**23**	**4**
1900–2099	**24**	**5**
2100–2199	**24**	**6**

Калі d+e больш за 9 – гэта дата красавіка,
калі менш – дата сакавіка.

Каб атрымаць дату Пасхі, робім яшчэ адну аперацыю:
d+e+22 – для сакавіка,
d+e – 9 – для красавіка.

Калі ў выніку атрымаецца 25 красавіка, але пры гэтым d=28 і a>10, Пасху трэба перанесці на тыдзень раней (г.зн. 18 красавіка).

Калі ў выніку атрымаецца 26 красавіка, Пасха заўсёды святкуецца 19 красавіка.

Прыклад

Вылічым, калі святкавалася каталіцкая Пасха ў 2000 г.
(a) 2000:19=105, рэшта 5;
(b) 2000:4=205, рэшта 0;
(c) 2000:7=285, рэшта 5
У табліцы знаходзім значэнне **M і N –** адпаведна 24 і 5;
(d) (19x5+24):30=3, рэшта 29
(e) (2x0+4x5+6x29+5):7=28, рэшта 3
29+3=32; 32>9;
32-9=23.
У 2000 г. каталіцкая пасха святкавалася 23 красавіка.

Каб вылічыць, на якія дні календара прыходзяцца іншыя рухомыя святы, прысвяткі і пасты, можна зрабіць простае вылічэнне, ведаючы як яны суадносяцца з днём Пасхі. Належыць памятаць, што рухомыя святы падзяляюцца на перадпасхальныя (першая палова) і пасляпасхальныя (другая палова). Дата

перадпасхальных святаў залежыць ад дня Пасхі, перад якой яны адзначаюцца. Пры акрэсленні перадпасхальных святаў належыць зважаць на тое, просты гэтв год, ці высакосны.

За сем тыдняў да Пасхі пачынаецца Вялікі пост, у яго пачатку каталікі адзначаюць Папелец (Popelec). За тыдзень да Пасхі адзначаецца Страстны тыдзень, які пачынаецца Вербнай нядзеляй.

Буйнейшае рухомае свята пасля Пасхі (Вялікадня) – Тройца або Пяцідзеятніца (Зялёныя святы, Зялёная нядзеля – у каталіцкай традыцыі), якая святкуецца на пяцідзесяты дзень пасля Пасхі, абавязкова ў нядзелю.

Для акрэслення рухомага свята можна таксама скарыстаць з табліцы.

ТЭМА 6. ПЕРАВОД ДАТ ЮЛЬЯНСКАГА КАЛЕНДАРА НА ГРЫГАРЫЯНСКІ. АКРЭСЛЕННЕ ДНЯ ТЫДНЯ ПА ГРЫГАРЫЯНСКАМУ КАЛЕНДАРУ

Пры пераводзе дат юльянскага календара на грыгарыянскі належыць памятаць, што розніца паміж імі змяняецца ў залежнасці ад стагоддзя. Крытычнай датай, калі розніца паміж двума календарамі змяняецца, з’яўляецца 29 лютага сотага года, які ў юльянскім календары высакосны, а ў грыгарыянскім просты.

Розніца паміж юльянскім і грыгарыянскім календаром

XVI ст – 10 дзён (з 1582 г.).
XVII ст – 10 дзён.
XVIII ст. – 11 дзён (з 1 сакавіка 1700 г.).
XIX ст. – 12 дзён (з 1 сакавіка 1800 г.).
XX ст. – 13 дзён (з 1 сакавіка 1900 г.).
XXI ст. – 13 дзён.

У гістарычных даследаваннях прынята карыстацца падвойным запісам даты – па юльянскаму і грыгарыянскаму календару – у тых выпадках, калі згадваюцца міжнародныя падзеі, у якіх прымалі ўдзел краіны, дзе выкарыстоўваліся розныя календары. Для напісання падвойнай даты выкарыстоўваюцца дужкі. Напрыклад, даты расійскай гісторыі, згодна з палажэннямі календарнай рэформы, да 1 лютага 1918 г. пішуцца наступным чынам: дата юльянскага календара (дата грыгарыянскага календара); пасля 1 лютага і да 1 ліпеня 1918 г. – дата грыгарыянскага календара (дата юльянскага календара).

Прыклады

Пачатак расійска-французскай вайны 1812 г. – 12 чэрвеня (24 чэрвеня) 1812 г.
Андрусаўскае перамір’е – 30 студзеня (9 лютага) 1667 г.
III Устаўная грамата БНР – 25 (12) сакавіка 1918 г.

Для акрэслення дня тыдня па грыгарыянскаму календару можна выкарыстаць формулы і табліцы.

Найбольш простым спосабам вылічэння даты з дапамогай формул і табліцы лічыцца спосаб Л.Т.Сахароўскага. Навуковец прапанаваў спецыяльны каляндар у выглядзе табліцы, у якім пазначаны як гады юльянскага, так і грыгарыянскага

календара. Пры вылічэнні дня тыдня Л.Т. Сахароўскі прапанаваў спецыяльны універсальны каэфіцыент «к», які адлюстроўвае наяўнасць высакосных гадоў, асаблівасці іх ужывання ў юльянскім і грыгарыянскім календарах.

Каляндар Л.Т.Сахароўскага

Стагоддзі		Гады				Месяцы	Зна- чэнне «к»
грыгар.	юльян.	дзесят -кі	адзінкі	дзесят -кі	адзінкі		
1500; 1900	1100;1800 1000;1700	00 40	0; 6 1; 7	90	0 1;6	студз.п, кастр., май	0 1
1400; 1800	900;1600 1500;2200	80	2 3;8	30 70	7 2;8	жнів., люты в. лют.п, сакавік лістапад	2 3
1700; 2100	1400;2100 1300;2000	20 60	9 4	 10	3;9 4	чэрвень верас., снеж.	4 5
1600; 2000	1200;1900		5	50	5	крас., ліпень, студзень в.	6

а) адзінкі гадоў належыць выбіраць у слупку, які стаіць побач з дзесяткамі, якія ёсць у даце;
б) парадкавыя нумары дзён тыдня: 0 – нядзеля; 1 – панядзелак; 2 – аўторак; 3 – серада; 4 – чацвер; 5 – пятніца; 6 – субота.

Каб вылічыць дзень тыдня па дадзенай табліцы, належыць зрабіць наступныя аперацыі.

Прыклад

Акрэслім, якім днём тыдня было 1 студзеня 1980 г. па грыгарыянскаму календару. Для гэтага ўявім згаданую дату наступным чынам: 19/8/0/студзень/1, дзе
19 – колькасць стагоддзяў па графе "грыгарыянскі каляндар" адпавядае – 0;
8 – лічба дзесяткаў гадоў – адпавядае –2
0 – колькасць адзінак гадоў – адпавядае –0
студзень высакосны – адпавядае – 0.
Склаўшы атрыманыя лічбы атрымаем: 0+2+0+6=8. Да гэтага выніка дададзім нумар даты, якую мы вылічаем, – 1 студзеня: 8+1=9. Атрыманы вынік належыць падзяліць на 7 – 9:7=1, рэшта 2. Рэшта як раз і будзе парадкавым нумарам дня тыдня.

Для вылічэння дня тыдня па грыгарыянскаму календару можна выкарыстаць табліцу «Акрэсленне дня тыдня па грыгарыянскаму календару». У ёй у адзінае зведзены вруцэлета, гады, месяцы і дні. Каб вылічыць дзень тыдня па табліцы, належыць зрабіць наступныя аперацыі.

1. Знойдзем вруцэлета зададзенага года. Для гэтага ў радках з сотнямі і тысячамі гадоў знойдзем належнае стагоддзе, а ў слупку з дзесяткамі і адзінкамі – адпаведныя даце лічбы. На перакрыжаванні іх знаходзіцца лацінская літара, якая пазначае вруцэлета дадзенага года.

2. У раздзеле табліцы, дзе пазначаны месяцы, знойдзем радок з месяцам, які ёсць у зададзенай даце, а затым працягнем гэты радок у бок літар вруцэлета і адшукаем знойдзеную раней літару задазенага года.
3. Ад знойдзенай літары вруцэлета правядзем лінію да пазначаных у нізе табліцы дзён тыдня. Затым у раздзеле лічбаў, якія пазначаюць даты, адшукаем належную дату месяца. Спалучыўшы гэтую дату з дадзенымі ў калонцы « Дні тыдня», атрымаем вынік.

Прыклад

Акрэслім, які дзень тыдня было 24 лістапада 1978 г.

Дзесяткі і адзінкі гадоў											
		56	57	58	59		60	61			
		62	63		64	65	66	67			
			68	69	70	71		72			
		73	74	75		76	77	**78**			
		79		80	81	82	83				
		84	85	86	87		88	89			
Тысячы і сотні гадоў		90	91		92	93	94	95			
			96	97	98	99			**Месяцы**		
1500	**1900**	G	F	E	D	C	B	**A**	студзень П.	кастр.	
1600	2000	A	G	F	E	D	C	B	май		
		B	A	G	F	E	D	C	люты В.	жнів.	
1700	2100	C	B	**A**	G	F	E	D	люты П.	сакав.	**лістап.**
		D	C	B	A	G	F	E	чэрвень		
1800	2200	E	D	C	B	A	G	F	верасень	снеж.	
		F	E	D	C	B	A	G	студзень В.	красав.	ліпень

Дні тыдня											
	пн	аўт	сер	чац	пт	сб	нядз	1	8	15	22	29
	аўт	сер	чац	пт	сб	нядз	пн	2	9	16	23	30
	сер	чац	**пт**	сб	нядз	пн	аўт	3	10	17	**24**	31
	чац	пт	сб	нядз	пн	аўт	сер	4	11	18	25	
	пт	сб	нядз	пн	аўт	сер	чац	5	12	19	26	
	сб	нядз	пн	аўт	сер	чац	пт	6	13	20	27	
	нядз	пн	аўт	сер	чац	пт	сб	7	14	21	28	

Такім чынам, 24 лістапада 1978 г. была пятніца.

ЗАДАННІ ДЛЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ

Тэма 1. Эра ад стварэння свету, сакавіцкі, ультрасакавіцкі і вераснёўскі пачатак года

Перавесці даты па эры ад стварэння свету на сучаснае летазлічэнне

Сакавіцкі стыль
6610 г., 20 красавіка
6825 г., 30 снежня
6721 г., 21 ліпеня
6725 г.
6608 г.

Ультрасакавіцкі стыль
6732 г., 4 верасня
6688 г., 25 мая
6665 г., 12 лістапада
6705 г.
6722 г.

Вераснёўскі стыль
6943 г., 25 сакавіка
6951 г., 13 лютага
7022 г., 8 верасня
7035 г.
7088 г.

Стыль крыніцы невядомы
6571 г., 12 красавіка
6674 г., 6 студзеня
6854 г., 28 лістапада
6919 г.
7003 г.

Тэма 2. Удакладненне даты па згадке індыкта года

2.1. Вызначыць індыкт года, карыстаючыся формулай

2.1.1. Вераснёўскі стыль
6923 г.
6995 г.
7028 г.
7131 г.

2.1.2.Сакавіцкі стыль

6566 г.
6741 г.
6780 г.
6891 г.

2.1.3. Ультрасакавіцкі стыль
6747 г.
6735 г.
6801 г.
6820 г.

2.1.4.Студзеньскі стыль
1488 г.
1515 г.
1532 г.
1540 г.

2.2. Вызначыць індыкт года, карыстаючыся табліцай

2.2.1. Вераснёўскі стыль
6935 г.
6985 г.
7003 г.
7137 г.

2.2.2. Сакавіцкі стыль
6554 г., 11 сакавіка
6768 г., 20 верасня
6787 г.,
6803 г.

2.2.3. Ультрасакавіцкі стыль
6751 г. 1 мая
6760 г.30 кастрычніка
6811 г.
6831 г.

2.2.4. Студзеньскі стыль
1492 г. 1 лютага
1510 г. 15 студзеня
1547 г.
1548 г.

2.3. Праверыць адпаведнасць года і індыкта, акрэсліць стыль дакументаў Літоўскай Метрыкі

2.3.1. «П(и)сан у Троце*х* м(е)*с*яца сентя*б*(ря) 28 дн(я) ле*т*а Б(о)жьего нароженя 1432, индикта 11.».
2.3.2. «П(и)сан у Львове под леты 1524, м(е)*с*яца октя*б*(ря) 8 день, индикта 13».
2.3.3. «Ле*та* тисеча пя*т*сот шос*т*ого, марта 16, индикта 10».
2.3.4. «Ле*та* 7002 сентя*б*(ря) 2 день, индикта 12».
2.3.5. «Ле*то* 7000, августа 13 день, индикта 10.»

2.4. Акрэсліць дату падзеі па індыкту

2.4.1. У крыніцы, падпісанай «Sygiymundus Rex», ёсць згадка аб саракавым годзе кіравання і індыкце 4. Датуйце крыніцу.
2.4.2. У крыніцы згадваецца вялікі князь Вітаўт, а дата пазначана наступным чынам: 12 сакавіка, індыкта 12. Вызначце год стварэння крыніцы.
2.4.3. У маскоўскай крыніцы часоў Лівонскай вайны значыцца індыкт 10, год, дзень і месяц адсутнічаюць. Датуйце крыніцу па эры ад стварэння свету і эры ад Раства Хрыстова.

Тэма 3. Даціроўка падзей па згадках астранамічных з’яваў

3.1. Праверце слушнасць згадкі аб сонечным і месячным зацьменні, акрэсліце стыль крыніцы

3.1.1. «В ле*то* 6694 м(еся)ца мая в 1 д(е)нь, на память с(вято)го пр(о)р(о)ка Иеремия, в среду на вечерни бысть знаменье в со*лн*ци…».
3.1.2. «В ле*то* 6621 бысть знамение в со*лн*ци, в 1 час дне бысть видити всем людем остася со*л*нца мало…м(еся)ца марта 19…»
3.1.3. У Ноўгарадскім першым летапісы па Сінадальным спісе пад 6632 г. згадваецца сонечнае зацьменне, якое адбылося 11 жніўня.
3.1.4. Крыніца паведамляе аб месячным зацьменні 3 лютага 6715 г.
3.1.5. У летапісы маецца згадка аб сонечным зацьменні 4 верасня 6695 г.
3.1.6. «В ле*то* 6744. Бысть знаменье в со(лн)ци, месяца августа 3, в неделю по обедех…».
3.1.7. Ці магло быць сонечнае зацьменне 9 чэрвеня 1489 г.?

3.2. Праверце магчымасць акрэслення даты і стыля па згадцы астранамічных з'яваў

3.2.1. Паводле адной з гіпотэз, Ф.Скарына нарадзіўся ў год сонечнага зацьмення, што і пазначыў у сваім аўтапартрэце. Ці магчыма акрэсліць год нараджэння Ф.Скарыны па гэтых звестках?
3.2.2. « Ле*та* 6765 авгус*та* 30 дн(я). Бы*с*ть видити на н(е)бе два со*лн*ци и месяц…».
3.2.3. «Ле*т*а 6790. Случися на н(е)бе в нощи яко круг ясный у месяца… в день Р(ожде)*с*тва Пр(е)*с(*вя)тые Б(огороди)цы…».

Тэма 4. Акрэсленне дзён тыдня па юльянскаму календару

4.1. З дапамогай таблiц акрэслiце, у якi дзень тыдня адбылася падзея

4.1.1. Нараджэнне Ісуса Хрыста.
4.1.2. Грунвальдская бітва.
4.1.3. Бітва на Куліковым полі.
4.1.4. Варфаламееўская ноч.
4.1.5. Заснаванне Гродзенскай губерні.
4.1.6. Пераправа Напалеона праз Нёман ў чэрвені 1812 г.
4.1.7. Выданне Маніфеста аб скасаванні прыгоннага права ў Расійскай імперыі.
4.1.8. Пачатак Першай сусветнай вайны.

4.2. Выкарыстоўваючы формулу Я.Ф.Карскага, акрэслiце, у якi дзень тыдня адбылася падзея

4.2.1. Праверце паведамленне Баркулабаўскага летапіса: «А потомъ по року 1576 ме(ся)ца августа 20 дня в понеделокъ у вечере дву годинъ в ночи п(а)нъ Баркулабъ переставился на *ст*аро*ст*ве Дисенском в замку Дисенке, а погребено ч(е)*с*(т)ное тело его у месте Виленск*ом* у це*р*кви С(вя)тыя Пречистыя Б(огород)ицы» .

4.2.2. Цытата з Літоўскай Метрыкі: «Лета Боже*го* тисяча пя*ть* со*тъ* шос*т*ого, в пятницу, м(е)*с*еца октe*б*(ря) вторыи день…» Праверце паведамленне крыніцы.

4.2.3. Забойства Паўла I ў Міхайлаўскім замку.
4.2.4. Растрэл дэманстрацыі ў Пецярбургу 9 студзеня 1905 г.

Тэма 5. Акрэсленне даты па згадцы хрысціянскіх святаў

5.1. Датуйце дакументы Літоўскай МЕтрыкі па згадцы рэлігійнага свята

5.1.1. «Datum na zamku glownym trockim tegoz Zygmunta krola w niedziele dnia swęta Wniebowzięcia Blogoslawionej Dziewiczy Maryi…» («Дадзены у троцкім замку таго ж Жыгімонта караля у нядзелю ў дзень свята Ушэсця Благаславёнай Дзевы Марыі…»; 1434 г.).

5.1.2. «W Grobnie na seymie walnym dnia Swiętego Zwiastowania Blogoslawionej Panny Marii…» («У Гродна на сэйме вальным у дзень Святога Звяставання Панны Марыі…»; 1522 г.).

5.1.3. «W Wilnie w sobote w wigilię swęta Swiętej Troicze…» («У Вільні ў суботу напярэдадні свята Святой Тройцы…»; 1535 г.).

5.1.4. «W Brześcy Litewskim na seymie walnym dnia swiętego Nowego Lata…» («У Брэсце Літоўскім на сэйме вальным у дзень святога Новага Года…»; 1519 г.).

5.1.5. «Datum Cracouiae feria quinta post Petri et Paulo, anno Domini 1524.» («Дадзены ў Кракаве цераз пяць дзён пасля Пятра і Паўла, ад Божага нараджэння 1524»).

5.1.6. «Cracouiae feria sexta in die Sancti Vitalis, anno Domini 1525.» («Кракаў, шэсць дзён перад Святым Духам, ад Божага нараджэння 1525”).

5.1.7. «Datum w Tlumaczu w poniedzialek po octawie swęta Ciala Bozego…» («Дадзена ў Тлумачу ў панядзелак праз восем дзён пасля свята Цела Божага…»; 1440 г.).

5.1.7. «Datum w Lucku w wigilią swiętych Symona i Judy apostolow…» («Дадзены ў Луцку напярдадні свята Сымона і Юды апосталаў…»; 1383 г.).

5.1.8. «Datum w Smoleńsku we czwartek w dzień swięta Sw.Waclawa» (Дадзены ў Смаленску ў дзень свята святога Вацлава”; 1508 г.).

5.1.9. « А тые мытники, ш*т*о тепер тое мы*т*о Менское держеть, маю*ть* им того мыта поступить на три короля…»; 1567 г.

5.2. Акрэсліце ці праверце даты, паказаныя ў крыніцы, з выкарыстаннем згадкі царкоўных святаў

5.2.1. Фрагмент дакумента Літоўскай Метрыкі: «Мають нам кождый год до скарбу нашого давати по сту ко*п* грошей литовское личбы. А рок им от сего прийдучо*го* Средопостья, што мае*ть* выйти индикта пя*т*огонадцa*ть*, от ко*т*орого часу мають они почати тое ванчусное на нас заведати и дер*ж*ати, до того *ж* року о Средопостье индикта перво*го*. А как полгода выдержав*ши*, мають нам половину пе*н*езей дати, а в кожный год по тому ж мають давати. Нижели тыми часы о Велицедни прийдучом мають нам дати початку – пя*т*деся*т* ко*п* грошей. П(ис)ан у Кракове под ле*ты* Бо*жего* наро*ж*ен*ья* 157б м(еся)ца марца 4 д(е)нь, индикта 15.».

5.2.2. Фрагмент дакумента Літоўскай Метрыкі: «Brańsk i folwarki Pan Dulski trzymać i używać będzie od dnia… swięta S. Jakuba Apostoła począwszy w rocu dzisieyszym 1567 do wyjścia trzech lat…”(“Браньск і фальваркі пан Дульскі трымаць і ўжываць будзе ад дня Св. Якуба апостала пачаўшы у годзе цяперашнім 1567, пакуль не скончацца тры гады…».

5.2.3. «А п(и)са*л* сию книгу нехто е*с*(ть) Березка з Новогоро*д*ка с лито*в*ского…А п(и)са*л* есми от початку книги са*м*, от до*ш*ки до половины от с(вя)т(о)го Семиона до соро*к* с(вя)тых…».

5.2.4. У Суздальскім летапісу пазначана: «В лето 6745 … Тогда придоша множество кровопроливец крестьянских бес числа, акы прузи, к Володимерю месяца февраля в 3 день в вторник прежде мясопусту за неделю…».

5.2.5. У Лаўрэнцеўскім летапісы пазначана «В ле*т*о 6745 придоша татарове ко Володимерю ме*с*яца февраля в 3, на память с(вя)тога Симеона, во вторник преже мсопуста за неделю…».

5.2.6. У “Трыёдзе поснай” са збораў Васкрасенскага Нова-Іерусалімскага манастыра ў г.Істра, якая захоўваецца ў Гістарычным музее ў Маскве, пазначана: «В лето 6 тысящное девятисотное семидесятое месяца марта 28 день на память

святаго преподобного отца нашего чюдотворца Стефана и святаго Лариона Новаго в 3 час нощи об нощь святаго воскресения преставися раб божий князь великий Васильевич. Июда душегубец, рок твой пришед».

***5.3. Па формуле Гаўса акрэсліце, калі была Пасха* ў**

5.3.1. 1569 г., 1709 г., 1772 г., 1863 г., 1917 г.
5.3.2. 1870 г. Які прысвятак адзначаўся 10 красавіка гэтага года?

5.4. Карыстаючыся формулай акрэсліце, калі святкавалася Пасха па грыгарыянскаму календару ў

5.4.1. 1596 г., 1634 г., 1654 г., 1793 г.
5.4.2. 1918 г. На які прысвятак прыпадае 25 сакавіка гэтага года?

